І ён адмовіўся ад калгаса. Што адбылося з гэтага, вы, думаю, ужо здагадаліся. Так, дзядуля быў аб'яўлены "врагом трудового народа". У 1934 годзе яго арыштавалі, канфіскавалі ўсё: і дом, і каня, і карову, і няхітрую сялянскую мэблю, і нават посуд. Затым ссылка з усёй сям'ёй — жонкай і трыма дзеткамі (мая мама была сярод іх старэйшай).

Шматлікія эшалоны цягнуліся тады з захаду на ўсход вялізнай краіны, куды ў вагонах-"цялятніках" перавозіліся сотні, тысячы адарваных ад роднай глебы беларускіх сем'яў. Калі ўсе яны "враги народа", то скажыце мне, непаважаныя сённяшнія сталіністы: **хто ж тады — народ**?

Я ўспамінаю аповеды дзеда, бабулі і мамы, як іх у глухой тайзе зімой "высыпалі" з вагонаў у снегавыя сумёты. Дзеду спатрэбіўся вопыт вайны — ён капаў зямлянкі, ратаваў сям'ю. Побач людзі (нашыя браткі-беларусы) паміралі "касякамі", асабліва дзеці, ад сцюжы, ад голаду. Ссыльным выдалі ручныя пілы — валіць векавую тайгу. Муку прывозілі адзін раз на месяц. Некаторыя не вытрымлівалі, хапалі яе жменямі і елі сырую, дабаўляючы молатую сасновую кару. Былі выпадкі, калі ў малых згаладалых дзяцей, якія накідваліся на гэтую мешаніну, разрываліся страўнікі. І гэта, непаважаныя сталіністы, ёсць, па-вашаму, "железный порядок"?

...Там, у далёкай ссылцы, нарадзіліся я, мае браты і сястра. Я рос у расійскім асяродку. Бацька мой па нацыянальнасці — рускі. І я ў пашпарце запісаны рускім. Але вось што цікава: дзякуючы дзядулю, бабулі, маме, дзядзьку і цётцы, я пачуваў сябе і застаўся беларусам. Дома ў сям'і размаўлялі заўсёды на добрай беларускай мове. А як свяціліся ва ўсіх вочы, калі гаворка заходзіла пра Радзіму, пра Беларусь! Мне, малому, ніколі яшчэ нябачаная, яна снілася ў казачнай красе: у яблыневай квецені, якую я таксама ніколі не бачыў, у россыпах жоўтага рачнога пяску. І мроіўся Днепр — бязмежны, бязмежны...

Няма ўжо нікога з тых родных, дарагіх, але ўдзячнасць да іх за прывітую мне любоў да Бацькаўшчыны жыве ў маім сэрцы.

...Толькі пасля рэабілітацыі, ужо ў часы "хрушчоўскай адлігі", сям'я змагла вярнуцца на Радзіму. Пасля службы ў арміі прыехаў на Беларусь і я. Упершыню — на сваю сапраўдную, аднятую ў мяне сталіністамі Радзіму.

І зноў, і зноў я спрабую зразумець: адкуль у людзей гэтая дзіўная настальгія па страшных часах? Нават калі адкінуць крывавыя рэпрэсіі, варта адказаць хаця б сабе: хіба ж асноўная маса людзей жыла тады як мае быць? Не, гэта былі жабрацкія часы. Многія жылі ў бараках ці ў адным пакойчыку на некалькі сем'яў, у камуналках-"клапятніках".

У думках пераношуся ўжо ў 1964 год. Кастрычнік. Адхіленне ад улады М.С.Хрушчова. Вакол зларадныя і задаволеныя абывацелі: "Так ему и надо, лысому! Довел, понимаешь ли, страну до очередей!" Як быццам пры Сталіне іх не было! Не было яшчэ большага мардавання і голаду!

У адрозненне ад многіх я цяжка перажываў гэтую падзею. Я верыў Хрушчову. Верыў, што ў 1980 годзе буду жыць пры камунізме. Я не мог яму не верыць! Менавіта ён, Мікіта Сяргеевіч, адкрыта асудзіў масавыя рэпрэсіі, менавіта ён рэабілітаваў незаслужана рэпрэсіраваных людзей, у тым ліку і маю сям'ю. Пры ім стала лягчэй дыхаць. З'явіліся, хоць і кволыя, зародкі дэмакратыі... Цяпер, у сталым узросце, я не перабольшваю значнасць гэтай фігуры, многае разумею інакш. Але не бачыць прагрэсу ў палітычнай сітуацыі таго часу было б несправядліва.

...На блізкай памяці — 1991 год. Падобная сітуацыя. Адхіленне ад улады М.С.Гарбачова. І зноў той жа самы абывацель, зларадны і задаволены: "Так ему и надо, этому болтуну! Выстроил, понимаешь ли, очереди за водкой!" Але ж ці не той самы Гарбачоў падняў нас з каленяў? Менавіта ён даў магчымасць для дэмакратызацыі грамадства! У выніку і ў рэшце рэшт Беларусь атрымала незалежнасць, аб чым мы раней і марыць баяліся!

Але значная частка насельніцтва ўздыхае па "залатых" брэжнеўскіх часах. Не хоча задумацца, адкуль браўся адносны дабрабыт той пары. Не хоча асэнсаваць, што вялікая імперыя бяздарна праядала і прапівала свае прыродныя багацці — нафту, газ, золата. Ці ж гэта магло працягвацца вечна?

Бацька маёй жонкі прайшоў фінскую вайну, з першых дзён Вялікай Айчыннай ваяваў на фронце. Але меў няшчасце параненым трапіць у палон. Пасля вызвалення савецкімі войскамі ў 1945 годзе ён не вярнуўся дахаты: сталінскаму рэжыму патрэбны былі новыя ахвяры. Яго заклеймілі "предателем" (як жа — быў у палоне!) і адправілі на катаржныя работы ў шахты. Вось ужо сапраўды — з агню ды ў полымя! Там, у далечыні ад Беларусі і сям'і, ён у 49 гадоў памёр ад хваробы лёгкіх.

Гады чатыры таму я з жонкай і сынам, з нашымі даўнімі і добрымі польскімі сябрамі наведалі былы фашысцкі канцлагер, Майданек пад Люблінам. Усё, што мы ўбачылі ў сучасным мемарыяльным комплексе, вялізным музеі Памяці, цяжка перадаць словамі: прылады катавання, газавыя камеры, смяротныя "лазні", шыбеніцы, печы крэматорыя... Але якім жа моцным было нашае здзіўленне, калі на адной са шматлікіх музейных фатаграфій мы ўбачылі жончынага бацьку, дзядулю майго сына! Ён быў сфатаграфаваны ў калоне савецкіх ваеннапалонных, апынуўшыся на пярэднім плане...

Жонка адразу спазнала свайго бацьку, бо ў нас былі ягоныя фатаграфіі ў ваеннай форме. З яе вачэй пакаціліся слёзы. Вось якой атрымалася яе сустрэча з татам, мая — з цесцем, а нашага сына — з дзядулем праз амаль пяцідзесяцігоддзе! Ягонае прозвішча мы знайшлі ў музейных спісах ваеннапалонных. Значыць, памылкі не было.

А цяпер адкажыце мне, непаважаныя сталіністы: чым істотна адрознівалася фашысцкае "пекла" ад камуністычнага "раю"? Толькі не спявайце песень пра "социализм с человеческим лицом". Фальшывыя гэта песні. Весь свет бачыў гэтае "лицо" ў розных варыянтах. А выскал у іх адзін.

...Звяртаюся да сённяшняй моладзі, прашу: дзеці, паважайце старэйшых, прайшоўшых цяжкімі шляхамі і не згубіўшых сваю душу, чалавечнасць, чэснасць. Але сярод сталых людзей ёсць і людзі "ўчарашняга дня". У значнай ступені менавіта яны ў 1994 годзе вызначылі на прэзідэнцкіх выбарах той "порядок", расхлёбвацца з якім давядзецца вам. Гэтых людзей лёс не закрануў рэпрэсіямі, і яны часам "не ведают, что творят". Будзьце цярпімыя да іх, а сапраўдных ветэранаў і патрыётаў глыбока шануйце. З кожным годам іх усё менш і менш. А безліч найлепшых сыноў Бацькаўшчыны даўно раскінулі свае святыя костачкі на ссылках, катаргах, Салаўках, Курапатах, фашысцкіх і сталінскіх канцлагерах, расстрэльных ірвах.... "Да минует вас чаша сия!".

Валерый ВАСІЛЬЕЎ настаўнік.
Брэст.

Выйшаў у свет дакументальны зборнік "Нацысцкае золата з Беларусі"

У Нацыянальным архіве краіне тыжаром у 500 экземпляраў выйшаў у свет зборнік дакументаў і матэрыялаў "Нацысцкае золата з Беларусі". Гэта навуковае выданне, падрыхтаванае аўтарамі-складальнікамі Уладзімірам Адамушкам, Галінай Кнацько і Наталляй Рэдказубавай, было выпушчана пры ўдзеле Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводстве і фінансавай падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонда "Узаемаразуменне і прымірэнне".

Як раней паведамляў БелаПАН, у снежні 1997 года ў Лондане адбылася міжнародная канферэнцыя, прысвечаная лёсу нацысцкага золата, нарабаванага нацыстамі ў гады другой сусветнай вайны ў насельніцтва акупіраваных краін. Па падліках экспертаў, кошт яго складае 2,2 млрд. долараў ЗША, прычым кожны грам гэтага багацця быў здабыты злачынным шляхам. Санкцыянаванае фюрэрам рабаўніцтва ажыццяўлялася спачатку ў Германіі, а потым за яе межамі па дакладна распрацаваных гітлераўскімі чыноўнікамі інструкцыях. Па даных Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў на часова акупіраванай тэрыторыі БССР, у выніку акупацыі страты асабістай маёмасці грамадзян Беларусі ў цэнах 1941 года склалі, улічваючы кошт захопленага золата, 23,6 млрд. рублёў.

У зборніку публікуюцца распараджэнні, інструкцыі, даняценні, спісы, справаздачы, пратаколы, акты, паказанні сведак і іншыя дакументы і матэрыялы аб канфіскацыі нацыстамі ў насельніцтва Беларусі залатых, срэбраных рэчаў і каштоўнасцей у 1941—1944 гадах, у тым ліку аб канфіскацыі золата ў яўрэйскага насельніцтва, заключанага ў гета. Дакументы і матэрыялы, што ўвайшлі ў кнігу, выяўлены ў Нацыянальным архіве Беларусі, у архіве Камітэта дзяржаўнай бяспекі краіны, у дзяржаўных архівах Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай абласцей, у занальных архівах Баранавічаў і Бабруйска. Даныя з актаў, што захаваліся ў архівах, зведзены ў спіс, які публікуецца ў якасці дадатку да зборніка.

Разам з іншымі дакументамі і матэрыяламі зборнік "Нацысцкае золата з Беларусі" будзе прадстаўлены Вашынгтонскай канферэнцыі па праблемах нацысцкага золата, якая адбудзецца 9—12 лістапада. На ёй плануецца перагледзець спіс краін, насельніцтва якіх атрымае кампенсацыю, і разгледзець пытанне аб уключэнні ў гэты спіс Беларусі.

Марат ГАРАВЫ.

Мікалай Бузо пацвердзіў інфармацыю аб магчымым падзеле комплексу "Дразды" на дзве часткі — прэзідэнцкую і пасольскую

Намеснік міністра замежных спраў Беларусі Мікалай Бузо пацвердзіў інфармацыю аб тым, што комплекс "Дразды", магчыма, будзе падзелены на дзве часткі — прэзідэнцкую і пасольскую. На брыфінгу ён паведаміў, што такі варыянт сапраўды разглядаецца і пасольствам паведамлена аб ім. Пры гэтым, па словах намесніка міністра, ніякіх адказаў на новыя прапановы пакуль не паступала. М.Бузо звязаў гэта з перыядам летніх адпачынкаў і складанасцямі пры перапісцы з-за гэтага.

У той жа час ён нагадаў пра сустрэчу 6 жніўня міністра замежных спраў Беларусі Івана Антановіча з часовымі паверанымі Германіі, Францыі і Вялікабрытаніі, падчас якой міністр падкрэсліў, што вяртанне кіраўнікоў дыпламатычных місій у "Дразды" немагчыма. Да гэтага М.Бузо змог дадаць толькі тое, што кожнай краіне, чыі інтарэсы закрануты ў спрэчцы вакол комплексу "Дразды", накіраваны канкрэтныя прапановы па новым размяшчэнні іх рэзідэнцый.

Аляксей АРЭШКА, БелаПАН.

Адмоўнае сальда знешнегандлёвага абароту Беларусі дасягнула 876 мільёнаў долараў

Па апошніх даных Міністэрства статыстыкі і аналізу рэспублікі, аб'ём знешняга гандлю Беларусі за студзень—чэрвень 1998 года дасягнуў 8149,7 мільёна долараў ЗША. Гэта на 13,9 працэнта больш, чым у першай палове 1997 года. У прыватнасці, аб'ём экспарту павялічыўся на 13,2 працэнта (да 3636,5 млн. долараў), імпарт — на 14,4 працэнта (да 4513,2 мільёна). Сальда знешнегандлёвага абароту застаецца адмоўным у памеры 876,7 млн. долараў ЗША.

Асноўнымі гандлёвымі партнёрамі Беларусі ў студзені—чэрвені 1998 года былі Расія (на яе долю прыпадала 60,9 працэнта ўсяго аб'ёму знешнегандлёвага абароту), Украіна (7,3 працэнта), Германія (5,3), Польшча (2,8), Літва (2), Італія і ЗША (па 1,6 працэнта). Пры гэтым доля Расіі ў параўнанні з першай паловай 1997 года вырасла на 5,2 працэнта, долі астатніх названых дзяржаў паменшыліся (напрыклад, Украіны — на 2,6 працэнта, Германіі — на 0,8 працэнта).

Сяргей СНЕГІН.

Хто помніць пра мёртвых, любіць жывых

У гарадскім пасёлку Мір Карэліцкага раёна адбылося адкрыццё помнікаў-мемарыялаў ахвярам Мірскага гета, якія загінулі тут 56 гадоў таму.

Відавочцы сведчаць, што ў лістападзе 1941 года фашысты забілі ў Міры амаль 1,5 тысячы яўрэяў. Тых, хто застаўся ў жывых — а іх было 850 чалавек, — змясцілі ў Мірскі замак, ператварыўшы яго ў гета. Аб даце знішчэння гэтых мірскіх вязняў даведаўся адзін са служачых нямецкай камендатуры і, дзякуючы яго смелай дапамозе, многім удалося ўцячы.

У Ізраілі цяпер існуе асацыяцыя былых вязняў Мірскага гета. На сабраныя імі сродкі і вяліся работы па стварэнні двух помнікаў-манументаў.


Аўтар асноўнага помніка, што знаходзіцца недалёка ад замка, — магістр архітэктуры, ураджэнец Ізраіля Цві Рашэў, продкі якога жылі і загінулі ў Міры. Аўтар помніка на месцы расстрэлу ў лесе — ураджэнец Міра, старшыня камітэта па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры архітэктар Дзмітрый Бубноўскі.

У Мір у гэты дзень прыехалі былыя вязні гета, іх нашчадкі з ЗША, Вялікабрытаніі, Ізраіля, Аргенціны, ПАР, Даніі, Канады.

На адкрыцці помніка-манумента выступілі міністр культуры нашай краіны Аляксандр Сасноўскі, Часовы Паверанны ў справах Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Рына Джэрасі і старшыня Карэліцкага райвыканкама Іван Шматко.

Нэлі КРЫВАШЭЕВА.

Стоп-кадр



Владимир Матросов — главный художник Витебского академического драматического театра имени Якуба Коласа. Однако его знают еще и как талантливого режиссера. Среди наиболее заметных постановок Матросова значатся "Песня пра зубра" Н.Гусовского, "Богданович и время", "Евангелие от Владимира" и другие.

Фото Александра ХИТРОВА.

Крадуць збожжа...

Цэлы бункер намалочанага азімага жыта вырашыў прысвоіць адзін з механізатараў саўгаса "Доўгаўскі" Клічаўскага раёна. Са свайго камбайна "Дон-1500" ён выгрузіў збожжа ў аўтамашыну вадзіцеля гэтай жа гаспадаркі. Але аперацыя з жытам не ўдалася. Па гарачых слядах работнікі Клічаўскага РАУС раскрылі злачынства. Усе 1050 кілаграмаў збожжа вернуты саўгасу, а супраць вінаватых узбуджана крымінальная справа і вядзецца следства.

Папаліся з украдзеным збожжам таксама машыніст сушыльнага комплексу і вартаўнік калгаса імя Леніна гэтага ж раёна. Яны ўкралі амаль дзвесце кілаграмаў насеннага азімага жыта. Як паведаміў карэспандэнту БелТА начальнік Клічаўскага РАУС Мікалай Таргоня, гэта збожжа таксама вернута ў калгас. А машыніста КЗС і вартаўніка раённы суд аштрафаваў на два з палавінай мільёны рублёў кожнага.

Мікалай НАЗАРОВІЧ.

Калі ласка!

Запрашаем на вучобу ў старадаўнюю Вільню

Восьмы год у Віленскім педагагічным універсітэце на факультэце славістыкі працуе кафедра беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры.

У сістэме беларускай адукацыі ў Літве яна займае цэнтральнае месца і на сёння з'яўляецца навукова-метадычным цэнтрам, які мае сталыя кантакты з шэрагам навучальных устаноў, грамадскіх арганізацый Літвы, Беларусі і іншых краін. Найбольш цеснае супрацоўніцтва наладжана з Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя М.Танка, Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Ф.Скарыны, Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў, Варшаўскім (Польшча) і Клагенфурцкім (Аўстрыя) універсітэтамі, даследчым Інстытутам гуманітарных навук у Нью-Йорку (ЗША) і інш.

Акрамя асноўнага накірунка сваёй дзейнасці — падрыхтоўкі спецыялістаў для беларускіх навучальных устаноў Літвы — кафедра актыўна распрацоўвае навучальныя праграмы і метадычныя дапаможнікі, арганізоўвае міжнародныя навуковыя канферэнцыі, удзельнічае ў распрацоўцы міждзяржаўных пагадненняў у галіне памежнага рэгіёна.

Нашы выпускнікі працуюць не толькі ў Віленскай беларускай гімназіі і пачатковых класах г.Вісагінаса, але і ў літоўскіх сродках масавай інфармацыі, Пасольстве Рэспублікі Беларусь, выкладаюць беларускую мову ў школах Мінска, Ліды, Віцебшчыны, працягваюць вучобу ў магістратуры.

Сёлета факультэт славістыкі дае жыхарам Беларусі унікальную магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці беларуская філалогія за мяжой у адной з самых прэстыжных ВНУ Літвы — Віленскім педагагічным універсітэце. Тэрмін навучання — 4 гады. Акрамя названай спецыяльнасці студэнты змогуць выбраць дадаткова яшчэ адну: руская філалогія, польская філалогія, журналістыка, методыка пачатковага навучання, гісторыя культуры (5 гадоў).

Навучанне завочнае — платнае. Набор будзе ажыццяўляцца без уступных экзаменаў па выніках конкурсу атэстатаў. Дакументы — (атэстат (копію) альбо дыплом вышэйшай школы, медыцынскую даведку, 4 фотакарткі (2х4), выпіску з працоўнай кніжкі (калі ёсць), заяву на імя рэктара) можна выслаць на адрас: **Baltarusiu kalbos, literaturos bei etnokulturos katedra Vilniaus pedagoginis universitetas Studentu g. 39-527 2034 Vilnius Lietuva.**

Зразумела, у заяве трэба назваць абраную спецыяльнасць:

беларуская мова і журналістыка;

беларуская і руская мова і літаратура;

беларуская мова і літаратура і гісторыя культуры;

беларуская мова і методыка пачатковага навучання;

беларуская і польская мова.

На тэрыторыі Беларусі дыплом Віленскага педагагічнага універсітэта мае юрыдычную сілу.

Падчас вучобы студэнты змогуць атрымаць льготныя візы, папрацаваць у багатых архівах і бібліятэках Літвы, пазнаёміцца з мовай і культурай народа-суседа, прыняць удзел у культурным жыцці беларускай дыяспары. Можна будзе таксама паспрабаваць свае сілы ў беларускіх праграмах радыё і тэлебачання, газетах Літвы. Урэшце — паблукаць па старажытнай Вільні і палюбавацца на славутыя цэрквы і касцёлы, спазнаць яе беларускія старонкі, а значыць, і ўласную культуру і гісторыю. А галоўнае — паслухаць лекцыі вядучых навукоўцаў-гуманітарыяў, сустрэцца з вядомымі культурнымі дзеячамі Літвы, Беларусі і замежжа.

За больш падрабязнай інфармацыяй запрашаем звяртацца напасрэдна да прыёмнай камісіі па тэлефоне ў Баранавічах **8-01634-7-05-03**, у Вільні — **8-103702-72-58-01, 73-18-41**.

Лілія ПЛЫГАЎКА, загадчык кафедры беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры ВПУ, доктар філалогіі.

Владимира Жириновского оштрафовали на 20 тысяч рублей

Похоже, ЛДПР и ее лидер Владимир Жириновский вскоре станут рекордсменами по числу предъявленных исков о защите чести и достоинства.

История почти трехгодичной давности, когда Владимир Вольфович оттаскал за волосы депутата Госдумы Евгению Тишковскую, закончилась вчера в Мещанском межмуниципальном суде Москвы. Как ни странно, но никакого ажиотажа не было — всего одна телекамера и тройка журналистов. Возможно, все уже забыли о, мягко говоря, неджентльменском поступке лидера либерал-демократов.

Напомним, что 8 сентября 1995 года Жириновский устроил потасовку прямо в зале заседаний Государственной думы. Кадры с этой безобразной сценой стали достоянием миллионов телезрителей. Известно, что лучшая защита – это нападение. И Жириновский, вместо того чтобы принести свои извинения Евгении Тишковской, решил оскорбить ее и в письменном виде. Сын юриста, очевидно, не слишком силен в юриспруденции, иначе бы он задумался о последствиях.

11 сентября 1995 года на креслах депутатов в Госдуме лежали листовки, подготовленные пресс-службой фракции ЛДПР. Текст листовки вполне соответствует скандальному поведению и несветским манерам Владимира Жириновского. Вот только некоторые цитаты из нее.

«Для Жириновского Тишковская — «белокурая бестия», как эстонка-снайпер. С первого дня она открыла охоту на все, что бы ни говорил, чего бы ни делал Жириновский. У нее не голос, а иерихонская прокуренная труба, завывающая на ударных гласных. ...Никто на Тишковскую в тот день не нападал. Это она, как из засады, напала. Она устроила потасовку.

...Печально, что в нашей Думе заседают такие вот бесы в юбках, как Тишковская».

По ходу дела фракция ЛДПР обвинила госпожу Тишковскую и в разворовывании золотого запаса России. А «белокурая бестия» вполне справедливо решила, что так оставлять это дело нельзя. И начала писать письма во всевозможные инстанции и искать хороших адвокатов. Евгения Тишковская хотела, чтобы против Жириновского было возбуждено уголовное дело. И это было бы правильно. Но все адвокаты, искренне бывшие на ее стороне, говорили, что это практически невозможно. Тогда спустя два с половиной года после думского скандала Евгения Тишковская обратилась с гражданским иском о защите чести и достоинства и деловой репутации.

Требования Евгении Тишковской были минимальными — в порядке опровержения обязать ответчиков выпустить бюллетень тиражом 999 экземпляров с публикацией текста опровержения в виде полного текста судебного решения. И возместить нанесенный моральный вред в размере, установленном судом.

Интересы Евгении Тишковской на суде представляли ее адвокаты из юридической фирмы «Де-юре» Татьяна и Ольга Кофановы. Ни сам Жириновский, ни его представители на суд не явились.

— Это уже второе заседание суда. Но представители ЛДПР никак не отреагировали, они не были ни на одном заседании. Это же элементарное неуважение к суду! — говорит Ольга Кофанова.

После того как федеральный судья Ирина Макарова выслушала адвокатов Тишковской, было вынесено решение суда: признать сведения, содержащиеся в листовке пресс-службы ЛДПР, порочащими честь и достоинство Евгении Тишковской. Обязать пресс-службу в течение десяти дней опубликовать текст опровержения, принести публичные извинения и взыскать с фракции ЛДПР в качестве компенсации за нанесенный Евгении Тишковской моральный вред 20 тысяч рублей.

Елена Лория.

На шутливой волне

"БиБ" — это уже почти серьезно

На днях в Минске состоялось общее собрание ЗАО "БиБ" (для любознательных поясню, что "БиБ" расшифровывается как "Бомж и Бутылка").

В собрании приняли участие представители контролируемой ЗАО территории, куда входят проспект Машерова и прилегающие к нему улицы, а также набережная Свислочи.

Основными вопросами, рассмотренными на собрании, были:

1. Усиление разъяснительной работы среди жителей района по сохранению стеклянной тары для нужд акционеров "БиБ", для чего принято несколько обращений к компетентным органам:

а) Просить ЖЭСы наклеить на каждый мусоропровод в домах памятку: "Бутылка — не средство для засорения мусоропроводов. Поставь ее рядом!!!".

б) В связи с тем, что по контролируемой территории протекает Свислочь, обязать движение "Яблоко" совместно с ОСВОД выставить плакаты: "Бутылка — не средство для спасения утопающих, а экологически вредный предмет, нарушающий природный баланс на дне реки".


в) Обратиться с просьбой к МВД республики усилить борьбу с нарушителями общественного порядка, использующими пустую бутылку как средство для выяснения отношений. Тем более что это ведет к увеличению нагрузки на Минздрав по "штопанью" резано-колото-рваных ран.

г) Просить президента и правительство республики об увеличении пенсий пенсионерам, так как быстроногие бабули и дедули "уводят" до 30% прибыли.

На собрании с отчетным докладом за первое полугодие выступил председатель Счетной палаты. Он сообщил, что за прошедшее полугодие ЗАО "БиБ" получило 237.000.000 рублей прибыли, из которых в бюджет республики возвращено 236.999.999 рублей, израсходованных на спиртные напитки. Один "зайчик" утонул в бутылке. В заключение участники собрания одобрили идею созыва городской конференции на тему "Бомж + Бутылка = Жизнь".

Протокол собрания вел Владимир ФОМКИН.

Кроссворд



По горизонтали: 3. Группа морских островов. 8. Духовой музыкальный инструмент без клапанов и отверстий. 9. Эстонский советский писатель. 10. Период последовательного повторения солнечных и лунных затмений. 13. Вознаграждение за произведение литературы и искусства. 14. Лесная ягода. 15 Небольшой ресторан на Кавказе. 16. Морской рак. 19. Усадьба, хутор в Прибалтике. 20. Традиционный театр в Японии. 21. Созвездие Южного полушария. 22. Английский писатель, автор романа "Пригоршня страха". 28. Мера жидких и сыпучих тел в Англии. 30. Напиток бессмертия в индуистской мифологии. 31. Английский архитектор, математик, астроном. 32. Легендарный родоначальник чехов, брат Леха и Руса. 33. Озеро в Турции. 34. Героический эпос у татар. 35. Кубовый краситель синего цвета. 38. Разменная монета Лаоса. 40. Русский капиталист, сахарозаводчик. 41. Народ в Индии. 42. Божество любви в римской мифологии. 44. Столица XV зимних Олимпийских игр. 46. Человек, жертвующий собой ради идеи. 47. Персонаж романа М.Лермонтова "Герой нашего времени". 49. Медленное истечение газов через малые отверстия. 51. Русский советский писатель, автор романа "Зависть". 53. Начало музыкального произведения со слабой доли. 54. Денежная единица европейского государства. 55. Сплав ртути с другим металлом.

По вертикали: 1. Архитектурный стиль XVI—XVIII вв. 2. Большая открытая посуда для вина в Древней Руси. 3. Южное дерево с ароматными плодами. 4. Сильно нагретый влажный воздух. 5. Датский композитор, скрипач XIX в. 6. В поэзии XVIII—XIX вв. небольшое элегическое стихотворение. 7. Собрание кардиналов, созываемое после смерти римского папы для избрания нового. 11. Вклады частных лиц и организаций в банках. 12. Райцентр в Пермской области. 17. Процесс исторического развития мира организмов. 18. Официальное сообщение о переговорах между государствами. 20. Стадия развития зародыша хордовых животных и человека. 23. Река в Венесуэле и Колумбии. 24. Ягненок как жертвенное животное. 25. Гипотетическая жидкость, которой до XVIII в. объясняли явление тепла. 26. В древности страна на западе Малой Азии. 27. Покровительство, протекция. 29. Слой твердых частиц, оставшийся после фильтрации суспензий. 36. Афинский стратег в I в. до н.э. 37. Дипломатический протест, адресованный правительству другого государства. 39. Совокупность судовых снастей. 41. В метрическом стихосложении стопа из долгого, двух кратких и долгого слога. 43. Горный хребет в Забайкалье. 45. То же, что доносчик. 48. Земельный надел, пожалованный феодалом в средневековых странах Востока. 50. Город в Республике Чад. 52. Прибалтийско-финское племя, вошедшее в состав финской народности.

Составил Мечислав НОВОГРОДСКИЙ, д.Заболоть Вороновского р-на Гродненской области.

Ответы на кроссворд, опубликованный в №141

По горизонтали: 7. Компонент. 8. Плебисцит. 10. Автомотриса. 11. Лавис. 13. Жокей. 15. Кускоквим. 19. Лекало. 20. Огурец. 21. Ретроград. 22. "Кукоара". 23. Поярков. 27. Антимонит. 28. Гоацин. 29. Основа. 30. Терренкур. 33. Бодяк. 35. Депре. 36. Амортизатор. 37. Лефортово. 38. Мороженое.

По вертикали: 1. Сортамент. 2. Колас. 3. Бештау. 4. Ресифи. 5. Мираж. 6. Дифферент. 9. Хоровод. 12. Инаугурация. 14. Окускование. 15. Корволант. 16. Сатуратор. 17. Верхоянск. 18. Модератор. 24. Прокофьев. 25. Змеевик. 26. Жаворонок. 31. Егоров. 32. Устюрт. 34. Кадры. 35. Драже.

Візіт

Прэзідэнт В'етнама наведае Беларусь з афіцыйным візітам

Прэзідэнт Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Чак Дык Льюнг 29-30 жніўня будзе знаходзіцца ў нашай краіне з афіцыйным візітам.

Паводле звестак БелТА, кіраўнік В'етнама правядзе перагаворы з першымі асобамі нашай краіны. У ходзе візіту запланавана таксама падпісанне двухбаковых міжурадавых і міжведамасных дакументаў. У прыватнасці, бакі маюць намер падпісаць пагадненне аб ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве, аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі і паміж Нацыянальным банкам Беларусі і Дзяржаўным банкам В'етнама.

БелТА.

22—29 жніўня ШТО, ДЗЕ, КАЛІ?

■ ТЭАТРЫ

Мінскі тэатр сатыры і гумару "Хрыстафор" *(у памяшканні Палаца культуры прафсаюзаў)* адным з першых запрашае на адкрыццё дванаццатага тэатральнага сезона.

22 жніўня — "Третьим будешь?", безалкагольныя пасядзелкі з гледачамі.

27 жніўня — "Хорошо сидим!", эстраднае прадстаўленне.

29 жніўня — "Женефис" Яўгена Крыжаноўскага.

■ ІМПРЭЗЫ

У канцэртнай зале "Мінск"

28 жніўня — выступае Валерый Меладзе.

■ ВЫСТАВЫ

У мастацкім музеі ў Віцебску працуе выстава "Таямнічы свет каменя", якую прывезлі супрацоўнікі Мінскага музея землябробства. Яшма, аметысты, біруза, змеевікі, малахіт, бурштын, нефрыт, прадстаўленыя на экспазіцыі, адлюстроўваюць цыклы існавання стыхій і энергій Зямлі як часткі Сусвету.

Огород в банке,
или Самый надежный способ сохранить здоровье без лекарств

Книга "Витамины-целители", год назад открывшая новую серию "Поле Чудес: здоровье", неожиданно для самих издателей стала настоящим бестселлером. 25-тысячный тираж, распроданный за считанные недели, потребовал повторной допечатки. И ее оказалось недостаточно: интерес к новинке минского издательства "Парадокс" проявили не только отечественные, но и зарубежные книготорговые фирмы. До сих пор спрос превышает предложение — случай поистине экстраординарный в условиях сегодняшнего рынка.

Тем временем издатели, ободренные столь очевидным успехом вроде бы не самой "крутой" книги, выпустили ее своеобразное продолжение. На этот раз читатель узнает, как внедрить витамины-целители в свой повседневный обиход, минуя аптеку. Книга "Консервируем сами" попутно отвечает и на многие вопросы, возникшие у читателей "Азбуки дачника" — еще одной из последних новинок "Парадокса".

Главная мысль, объединяющая все упомянутые издания в тематически связанную триаду, вынесена на обложку книги, о которой пойдет речь: "Пучок свежей зелени с небольшой грядки порой способен сделать то, что не под силу иным дорогостоящим лекарствам". Но как сохранить живительные свойства растений до нового урожая, тем самым обеспечив свою семью природными витаминами на весь год? Об этом и рассказывают читателю авторы книги "Консервируем сами" А.В.Руцкий и Р.Э.Лойко.

Кому-то, возможно, подумается: не к сезону вышла новинка — рачительные хозяева уже сделали все заготовки на зиму! Но, во-первых, не все: скажем, капусту понимающие люди всегда ставят поздней осенью или даже в начале зимы, перед морозами. Так что в самый раз полистать книгу, где об этом рассказывается во всех подробностях: какие сорта отбирают для заготовок, в каких пропорциях и что именно добавляют к основному продукту, в чем секрет получения отменного вкуса...

А во-вторых, в-третьих, в-четвертых... Секретов такого рода — великое множество, и ими щедро делятся с читателем авторитетные специалисты по технологии хранения и переработки пищевых продуктов. С их помощью можно смело приниматься за консервирование не только овощей и фруктов, но и рыбных, мясных, молочных продуктов — такие рецепты также содержатся в книге.

Словом, если вы хотите без опаски лакомиться деликатесами собственного приготовления, причем круглый год, — эта книга для вас! А лучшего подарка женщине, которой хотелось бы прослыть хорошей хозяйкой, просто не придумаешь. И ко дню рождения, и к 8-му Марта, и к Новому году...

"Соль" этой полезной книги еще и в том, что издана она при спонсорском участии ОАО "Мозырьсоль" — крупнейшего в республике производителя продукта, без которого при консервировании просто не обойтись.

Книгу "Консервируем сами" отдельно или в подарочном комплекте с "Витаминами-целителями" и "Азбукой дачника" по льготной цене можно заказать в издательстве "Парадокс" по адресу: **Минск, ул.К.Маркса, 21-25, тел. (017) 227-36-57.**

А в качестве бесплатного приложения к будущей покупке — один из множества не совсем обычных рецептов, которые предлагает вам книга "Консервируем сами".

Капуста квашеная по-болгарски

Для приготовления 50 кг продукта: капуста свежая — 60 кг, вода — 20 л, соль — 1,6 кг, ячмень — 360 г.

Крепкие белые кочаны средней величины и несколько красных (они придадут рассолу цвет) очищают от верхних листьев, крест-накрест разрезают у основания кочерыжки и вверх кочерыжками укладывают в бочку с отверстием для стока рассола. На дно для ускорения процесса закваски кладут немного ячменя.

Для приготовления рассола соль растворяют в кипящей воде. Если жидкость окажется мутноватой, ее процеживают через марлю. В бочку заливают рассол, чтобы он покрывал капусту, а сверху накрывают деревянным кружком и придавливают грузом.

Пока идет засол, надо несколько раз сливать и снова заливать в бочку жидкость, тогда капуста просолится равномерно. В первую неделю рассол сливают через день, во вторую через 2—3 дня, а затем — раз в неделю. Когда квашеная капуста готова, кадку плотно закрывают крышкой и хранят ее содержимое при температуре 10—12 градусов выше нуля.

Приятного аппетита!

Суббота, 22 августа

БТ

07.00 Доброе утро, Беларусь!
08.00, 15.00 Новости.
08.20 Сериал "Четыре танкиста и собака" (Польша).
09.15 "Я рисую".
09.35 Детская нейрохирургия.
10.05 Духовная программа.
10.35 "Кинотавр-98". Передача 2-я.
11.05 "Все нормально, мама!".
11.40 Око. О рекламе и не только...
12.00 Телевикторина.
12.25 Сделано в Беларуси. Новополоцкое ПО "Полимир".
12.45 Х/ф "Гори, гори, моя звезда" (1969 г.).
14.20 Телеспорт.
15.15 К 70-летию Национальной Академии наук Беларуси.
15.45 "Память, будто звезду, зажги..." К 75-летию заслуженного деятеля искусств Беларуси Владимира Станкевича.
16.20 "Древо жизни". Телеочерк.
16.45 Поэтические новеллы. Произведения А.Мицкевича. К 200-летию со дня рождения.
17.10 Д/ф "Большой лес".
17.40 Ток-шоу "Это моя работа". Тренер.
18.15 Х/ф "Бесконечная история".
19.45 Из достоверных источников.
20.05 Ток-шоу "Карамболь" с участием Ярослава Евдокимова.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 Комедия "Паспорт" (Россия — Франция, 1990 г.).
23.30 Белорусский хит-парад. Итоги недели.
23.45 Третий тайм.
00.05 Видимо-невидимо.

ОРТ

07.00 Х/ф "Эскадрон гусар летучих". 1-я с. (СССР, 1980 г.).
08.30 "Добрыня Никитич". Мультфильм.
08.45 Слово пастыря. Митрополит Кирилл.
09.00, 14.00, 16.50 Новости.
09.10 Домашняя библиотека.
09.30 "Утренняя почта".
10.05 "Каламбур".
10.40 Смак.
11.00 Возвращение Третьяковки.
11.35 Фильм "Овертайм".
12.30 Х/ф "Горожане".
14.20 "Цивилизация".
14.50 В мире животных.
15.30 "Кот в сапогах". Мультфильм.
15.55 Футбол. Чемпионат России. "Спартак" — "Крылья Советов".
17.55 Комедия "Большая перемена". 3-я с.
19.10 Джентльмен-шоу.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 "КВН-98". Музыкальный фестиваль в Юрмале.
22.55 Легкая атлетика. Чемпионат Европы.
00.00 Детектив "Приманка".

РТР

09.00 Доброе утро, страна!
09.45 Кроссворд.
10.10 Почта РТР.
10.40 Любовь с первого взгляда.
11.05 Подиум д'арт.
11.30 "Домашний очаг". Информационно-развлекательная программа.
12.00 Сериал "Неделя в Санта-Барбаре".
13.00, 19.00 Вести.
13.30 Люди и деньги.
14.00 Федерация.
15.00 "Башня".
15.30 Спортивная программа. Легкая атлетика. Пляжный волейбол.
17.55 Моя семья.
19.30 Мелодрама "Любовь с привилегиями" (1990 г.).
21.50 Звезды XXI века.
23.10 Авантюрная мелодрама "Слезы Святого Петра".
00.55 Адамово яблоко.

КУЛЬТУРА

09.10 "Читая Библию". Ветхий Завет.
09.20 Д/ф "Незнакомый и удивительный мир".
09.50 "Луна". Научно-популярный фильм.
10.50 Ток-шоу "Наобум". Николай Еременко.
11.20 Х/ф "Тридцать девять ступеней" (Великобритания, 1935 г.).
12.45 Ортодокс.
13.00, 21.00 Новости культуры.
13.15 Петербургский гурмэ.
13.30 Спектакль "День рождения Паганеля".
14.15 Лики истории.
14.45 Балет Мариинского театра в Смольном соборе.
15.00 Волшебный чемодан.
15.15 "Поэт в России больше, чем поэт".
15.40 "Кто там...".
16.10 "Вспышка". Новости кино.
16.30 "Личное дело".
17.00 Новости.
17.05 "2003".
17.15 Блеф-клуб.
17.50 "Осенние портреты". "Монолог длиною в жизнь". Ч. 1-я.
18.20 Культура вне границ.
19.00 Мультфильм.
19.15 Чудо-сказка.
19.30 Д/ф "Искусство зоны".
20.30 "Кумиры".
21.25 Ф.Шуберт. Трио N2.
21.50 Х/ф "Мадо, до востребования".

НТВ

07.00 Комедия "Старики-разбойники".
08.30 Мультсериал "Супермен".
09.00 Сегодня утром.
09.10 Криминал. "Чистосердечное признание".
09.30 Телеигра "Пойми меня".
10.00 Сериал "Магические приключения".
10.45 От "Винта"!
11.00, 15.00 Сегодня днем.
11.25 Музыкальный фильм "Труффальдино из Бергамо". 1-я и 2-я с. (СССР, 1977 г.).
13.40 Мультфильм "Прометей".
14.00 Свадьба.
14.30 Своя игра.
15.15 Суд идет.
16.10 Сериал "Полицейская академия".
17.00 Дог-шоу. Я и моя собака.
17.30 Герой дня без галстука.
18.00, 21.00 Сегодня вечером.
18.45 Музыкальная комедия "Мы из джаза" (СССР, 1983 г.).
В 20-е годы в Одессе три музыканта создали первый в Стране Советов джаз-банд.
20.45 Куклы.
21.35 Комедия "Бабник" (1990 г.).
Стареющий ловелас (А.Ширвиндт) с переменным успехом пытается передать свой жизненный опыт другу и собственному сыну. Последний оказывается весьма восприимчивым... Режиссер А.Эйрамджан. В других ролях М.Державин, И.Муравьева, Г.Беляева, Л.Полищук и др.
22.50 "Империя страсти".
23.30 "Футбольный клуб представляет чемпионат России". 22-й тур.

8-й канал

15.00 Джойс Майер "Жизнь в слове".
15.30 Х/ф "Гардемарины, вперед". 1-я и 2-я с.
18.00 Мультфильм "Эвоки".
19.30 Европейские видеоклипы.
20.00 Х/ф "Кентервильское привидение".
21.45 Спутниковый канал "Альфа".
22.00 Х/ф "Бурная река".

Воскресенье, 23 августа

БТ

07.00 Доброе утро, Беларусь!
08.00, 15.00 Новости.
08.15 Сериал "Четыре танкиста и собака" (Польша).
09.15 "Все дело в шляпе". Развлекательно-познавательная игра-викторина.
09.40 Вас вызывает Спортландия. Товарищеская встреча по детским подвижным играм команд школьников в Республиканском пионерском лагере "Зубренок".
10.30 Туробъектив.
10.55 "Все нормально, мама!".
10.30 Арсенал.
11.55 Белорусский дом.
12.25 Наталья Томышева и ансамбль "Светлячок".
13.10 "Принцесса подводного царства". Мультфильм (Япония).
14.15 Олимп.
14.30 Сельчане. Минская область.
15.20 Золотые ключи. Телефестиваль народного творчества.
15.50 "Жизнь. Вдохновение. Судьба". Телеочерк.
